нацыянальным заканадаўстве, адсутнасць эфектыўнага механізму прававой абароны адносін у сферы персанальных даных, бачыцца мэтазгодным развіваць заканадаўства ў гэтым кірунку.

Сучасны этап развіцця грамадства характарызуецца актыўным укараненнем тэхнічных сродкаў кіравання і інфармацыйных тэхналогій ва ўсе сферы яго жыцця. У сувязі з гэтым неабходна вырашыць пытанне аб абароне інфармацыі, назапашваемай у камп'ютэрных сістэмах, сетках, на машынных носьбітах. Магчыма найбольшай увагі патрабуюць да сябе адносіны, якія ўзнікаюць у сетцы Інтэрнэт, бо з кожным днём усё больш і больш людзей сутыкаюцца з неабходнасцю выкарастання Інтэрнэт-рэсурсаў, тым самым павялічваючы колькасць суб'ектаў інфармацыйных адносін. Апошнім часам пачалі рабіцца пэўныя захады па ўрэгуляванні гэтага сегмента, але гэта толькі нязначная частка таго, што патрабуе прававога рэгулявання.

Такім чынам, заканадаўствам прадугледжаны шырокі пералік відаў адказнасці за правапарушэнні і злачынствы ў інфармацыйнай сферы, аднак, відавочна і тое, што сёння патрабуецца ўзмацненне практычнай праваўжывальнай дзейнасці ў дадзенай сферы грамадскіх адносін.

**Літаратура**


1. *Хачатуров Р. Л.* Общая теория юридической ответственности. Москва: Юридический центр Пресс, 2007.
2. *Витрук Н. В.* Общая теория юридической ответственности. Москва: Норма, 2009.


## ПЕШЫЯ ПІЛІГРЫМКІ Ў РОСІЦУ ЯК ФЕНОМЕН РЭЛІГІЙНАГА ТУРЫЗМА БЕЛАРУСІ


## Д. У. ФІЛІПЧЫК


Рэлігійны турызм з'яўляецца неад'емнай і вельмі важнай часткай сусветнага турызма. У цяперашні час у свеце больш за 200 млн. чалавек у год удзельнічаюць ў паломніцтвах і рэлігійных вандраваннях, прычым больш за 70 % з іх гэта хрысціяне [1, с. 385]. Па прагнозе Сусветнай турыстычнай арганізацыі, да 2020 г. рэлігійны турызм увойдзе ў чацвёрку самых папулярных відаў турызма ў свеце [2].

У дзяржаўнай праграме развіцця турызма ў Рэспубліцы Беларусь на 2011–2015 гг. сярод накірункаў развіцця турызма адзначаны і рэлігійны турызм [3]. Праведзеныя сацыялагічныя даследаванні сведчаць аб тым, што значная частка рэспандэнтаў, асабліва сярод моладзі, гатова ўдзельнічаць у рэлігійным турызме [4, с. 241]. Рэлігійны турызм выклікае цікавасць не толькі з боку вернікаў, але і з боку іншых слаёў насельніцтва, што надае гэтаму віду турыстычнай дзейнасці асаблівае значэнне для развіцця ўнутранага турызма ў Беларусі [5, с. 72]. Паколькі

рэлігійны турызм уяўляе сабой значную з’яву ў межах сусветнай супольнасці, а разам з тым і ў межах нашай рэспублікі, то гэты накірунак турыстычнай дзейнасці патрабуе далейшага вывучэння.

Пешыя пілігрымкі ў Росіцу з’яўляюцца адным з праяўленняў рэлігійнага жыцця ў Беларусі [6, с. 117] і ў той жа час гэта амаль не даследаваная сфера рэлігійнага турызма. Таму вывучэнне пешых пілігрымак у Росіцу з’яўляецца актуальнай справай, вынікі якой могуць мець практычнае прымяненне.

Даследаваць пешыя пілігрымкі ў Росіцу было вырашана на прыкладзе адной з іх, а менавіта, на прыкладзе пілігрымкі Барысаў-Росіца 2011, удзельнікам якой з’яўляўся сам аўтар даследавання і метадам уключанага назірання праводзіў збор матэрыялаў, якія пасля ўвайшлі ў прыватны архіў аўтара. Прыватны архіў сабраны ў ліпені 2011 г. і аснову яго складаюць 9 інтэрв’ю, якія былі ўзяты ва ўдзельнікаў пешай пілігрымкі Барысаў-Росіца 2011. Інфарматы выбіраліся з разлікам таго, каб улічыць меркаванні і сведчанні людзей, якія займаюць рознае сацыяльнае становішча і належаць да розных полаваўзроставых груп.

На падставе праведзенага даследавання можна з упэўненасцю сцвярджаць, што пешыя падарожжы ў Росіцу адносяцца да сферы рэлігійнага турызма і з’яўляюцца адной з яго разнавіднасцяў – паломніцтвам.

Па сваёй *сутнасці* гэта добраахвотная арганізаваная групавая каротка- ці доўгатэрміновая пілігрымка да канфесійнага культавага месца, якая прымеркавана да пэўнай рэлігійнай падзеі і праходзіць у межах адной краіны. Пешыя пілігрымкі належаць да сферы рэлігійнага турызма Беларусі і ўляюць сабой значную з’яву, якая дынамічна развіваецца і мае шырокія перспектывы і магчымасці для свайго далейшага развіцця.

Жыццёвы шлях і акалічнасці пакутніцкая смерці Антоні Ляшчэвіча і Юрыя Кашыры сталі падставай для кананізацыйнага працэса, які завяршыўся беатыфікацыяй росіцкіх пакутнікаў. Беатыфікацыя Антоні Ляшчэвіча і Юрыя Кашыры стала пачаткам устанаўлення і распаўсюджвання культа росіцкіх пакутнікаў як у Беларусі, так і па ўсім свеце. Адной з форм пашырэння культа росіцкіх пакутнікаў сталі штогадовыя пешыя пілігрымкі.

Штогадовыя пешыя пілігрымкі ў Росіцу адносна новая з’ява, якая паступова становіцца традыцыяй, але пры гэтым пешыя пілігрымкі ў Росіцу маюць вялікі патэнцыял для развіцця і пашырэння паломніцкага руху ў межах Віцебскай дыяцэзіі і ўсёй Беларусі. Удалае спалучэнне маршрута і працягласці пілігрымкі разам з задзейнічаннем разнастайных сродкаў распаўсюджвання інфармацыі аб ёй спрыяюць пашырэнню

паломніцкага руха сярод каталіцкага і, што не мала важна, сярод праваслаўнага насельніцтва Беларусі.

У пешых пілігрымка прымае ўдзел спецыфічная катэгорыя насельніцтва, яка ў жыцці карыстаецца рэлігійным светапоглядам. Пілігрым у большасці выпадкаў гэта глыбока рэлігійны чалавек з ужо склаўшайся сістэмай каштоўнасцяў, гатовы на пэўныя ахвяры падчас пілігрымкі.

Асноўную масу пілігрымаў складае моладзь і дзеці, што спрыяе пашырэнню і замацаванню традыцый паломніцтва ў свядомасці людзей і дае шырокія магчымасці для развіцця паломніцкага руху ў будучыні.

Паводле прааналізаваных дадзеных *тыповы пілігрым* гэта, як правіла, маладая жанчына 23 год, каталіцкага веравызання, якая пражывае ў горадзе і якая адмовілася ад сваіх звыклых заняткаў, каб накіравацца ў пілігрымку. Такая полава-ўзроставая і тэрытарыяльная суадносіна накладае свой адбітак на ўвесь ход пілігрымкі і яе спецыфіку. Спецыфіка пілігрымкі заключаецца ў тым, што яна з'яўляецца своеасаблівым духоўным практыкаваннем, прасякнута малітоўным настроем і часцей за ўсё вымагае ад чалавека здзяйснення пэўных рэлігійных практык.

Каталіцкі Касцёл Беларусі выступае ў якасці адзінага арганізатара пешых пілігрымак у Росіцу. Падрыхтоўка да пілігрымкі распачынаецца інфармацыйным этапам. Для інфармавання выкарыстоўваюцца спецыфічныя сродкі: казанне святароў, парафіяльныя абвесткі і непасрэдны прыклад пілігрымаў. Задзейнічаны і сродкі масавай інфармацыі, якія ў выпадку пешых пілігрымак у Росіцу даюць большы эфект, чым пры распаўсюджванні інфармацыі аб пешых пілігрымках у Будслаў [7, с. 592].

**Літаратура**


1. Туристская энциклопедия Беларуси / И. И. Пирожник [и др.]; под общ. ред. Пирожника И.И., М.: Беларуская энцыклапедыя, 2007.
2. Религиозный туризм в Беларуси [Электронны рэсурс] / Беларускі партал Царква. Интернет-адрес: http://churchby.info/bel/b/index.php?page=5.
3. Государственная программа развития туризма в Республике Беларусь на 2011 - 2015 годы [Электронный ресурс] / сайт Министерства спорта и туризма Республики Беларусь. Интернет-адрес: http://www.mst.by/ru/ normativno-pravovaya-basa.
4. *Гузовская О. Н.* Перспективы развития религиозного туризма в Республике Беларусь // Актуальные проблемы экономического развития Республики Беларусь и его правовое регулирование: материалы III Республиканской научно-практической конференции (г. Минск, 12 июня 2008 г.) / [научный редактор Г. Б. Шишко]. С. 240–241
5. *Павловская О. В.* Проблемы и перспективы развития религиозного туризма а Республике Беларусь / О. В. Павловская // Предпринимательство в Беларуси:

опыт становления и перспективы развития / [под общей редакцией В.В. Шевердова]. Ч. 2. С. 72–73.
6. *Ганскі У. А.* Рэлігійны турызм (паломніцтва) на Полаччыне / У. А. Ганскі // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета. – Новополоцк: ПГУ, 2004. С. 116–117. Вып. 34.
7. *Філіпчык Д. В.* Пешыя пілігрымкі ў Будслаў як феномен рэлігійнага турызму Беларусі / Д. В. Філіпчык // Сборник тезисов докладов Республиканской научной конференции студентов и аспирантов Республики Беларусь "НИРС-2011" 18 октября 2011 г., Минск / редкол.: С. В. Абламейко [и др.]. Минск: Изд. центр БГУ, 2011. С. 592.

# ПРАБЛЕМЫ КЛАСІФІКАЦЫІ ТВОРАЎ ВЫШЫЎКІ КАЛЕКЦЫІ «НАРОДНАЕ ТКАЦТВА» ВУЧЭБНАЙ ЛАБАРАТОРЫІ МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БДУ

**Д. Д. Шаткова**

Калекцыя «Народнае ткацтва» (117 адз.зах.) з’яўляецца структурнай адзінкай этнаграфічнага аддзела Вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ. Яе фарміраване пачалося напрыканцы 1950-х гг., аднак да сённяшняга часу знаходзіцца на першаснай ступені ўліку і даследавання. Акрамя таго, вывучэнне калекцыі ўскладняецца па прычынах страты часткі дакументацыі [1] падчас пераезду вучэбнага музея з галоўнага корпуса БДУ ў будынак па вул. Чырвонаармейская, 6.

На сённяшнім этапе даследавання вышэйадзначанай калекцыі класіфікацыя музейных прадметаў стала вядучым спосабам вывучэння. Зараз прадметы калекцыі дзеляцца па 3 асноўных параметрах: 1) па функцыянальным прызначэнні прадметаў; 2) па матэрыяле вырабаў; 3) па тэхніках аздаблення твораў**.** Зыходзячы з апошняй класіфікацыяй ў калекцыі «Народнае ткацтва» вылучаюцца 46 вырабаў, аздобленых вышыўкай. Гэта прадметы традыцыйнага беларускага адзення: кашулі, кофта, фартухі, наміткі, хустка, а таксама тканыя вырабы для абсталявання і аздаблення жылля: ручнікі, сурвэткі, газетніца. Па вышэйназваных прычынах ў шэрага вышываных твораў (21 выраб) адсутнічаюць звесткі аб часе і месцы стварэння, аўтарстве, функцыянальным прызначэнні.

У сувязі з гэтым вышываныя вырабы з калекцыі «Народнае ткацтва» поўнасцю ўпарадкаваць у найбольш пашыраныя ў музейнай практыцы класіфікацыі – храналагічную і геаграфічную – немагчыма на сучасным этапе даследаванасці вышэйназванай калекцыі.

Затое вышыўцы ўласцівы шэраг мастацкіх хрaктарыстык: тэхніка выканання, кампазіцыйная пабудова арнамента, яго каларыт. Зыходзячы з пералічаных асаблівасцяў нам уяўляецца магчымым прымяніць для вы-